# ARCHE 4 – 1999

Тэма нумару:

## Паталёгіі грамадзтва




## ЗЬМЕСТ

Ад рэдакцыі
*Павал Севярынец* Грамадзтва граху

**паталёгіі грамадзтва**

Па старонках беларускіх часопісаў
*Валерка Булгакаў.* Блізіня нуля
Пераклады Дзядзькі Васіля Бэртальт Брэхт. Ёган Вольфганг Гётэ
Наркотыкі: гісторыя, склад, дзеяньне
*Канстанцін Дронт.* Дзевяць гадоў я знаёмы з марыхуанай
Малы чырвона–зялёны цытатнік

**гісторыі**

*Вячаслаў Адамчык.* Бронікі, альбо Навэля пра каня
*Жорж Батай.* Нябожчык
*Алесь Кавальчук.* Вясельле на хутары
*Ірвін Уэлш.* Стоўк Ньюінгтан блюз. Квартэт сэксуальных бедаў. Праз калідор

**аўтапартрэты**

*Славамір Адамовіч.* Чарнавікі
*Адам Глёбус.* Выдавец
*Анатоль Прасаловіч.* Аўтадафэ аўтатэіста

**архіў**

*Ільля Куркоў.* Як гадавалася «трэцяе пакаленне»

**гуманістыка**

*Андрэй Екадумаў.* Пад апекай сярэдняга брата
*Вольфганг Закс.* Зямля вачыма астранаўта

**лірыка**

*Андрэй Хадановіч.* Калыханка для маладога літаратара
*Бога.* Бабулькі

**філязофія**

*Тэадор Адорна.* Пра традыцыю

**крытыка**

*Максим Стріха.* Славомир Адамович: Поет із країни поза епохами та дискурсами

**прабел**
*Zmicier Saloskin.* Cuzajedy

**хроніка**
*Зьміцер Гарбуноў.* Хвароба

**запісы**
*Людміла Рублеўская.* Два дні ў Маскве й трынаццаць год між імі

**кніга**
*Пэтэр Гандке.* Шэршні

KAMUNIKAT.org

# Ад рэдакцыі

*Паталёгія — разьдзел мэдыцыны, які вывучае хваравітыя працэсы ў чалавечым і жывёльным арганізмах*

Ці мусім мы гаварыць аб паталёгіях, аб хваробах, тым самым як бы адводзячы ім законнае месца? Паталёгіі вывучаюць для таго, каб вылечыць, г.зн. прывесьці да нормы. Ведама ж — калі не лячыцца, дык можна памерці. Паталёгія грамадзтва — гэта адхіленьне ад нормы. Калі разглядаць грамадзтва, як жывы арганізм, дык не спраўджаецца сьцьверджаньне, быццам норма — гэта быць як усе ці як большасьць, бо гэтая большасьць можа быць хворая. Часам да хваробы можна і прывыкнуць, але ж здаровым ад гэтага ня станеш.

Хочам нормы. Але што гэта — норма? Даўней яна вызначалася *традыцыяй*. Цяпер жыцьцё ў індустрыяльным грамадзтве залежыць не ад традыцыяў, а хутчэй ад *моды* на прадметы і на думкі. Усё ж традыцыі, якія склаліся на працягу тысячагодзьдзяў і дазволілі чалавецтву выжыць як біялягічнаму віду, ёсьць неад'емнай часткай нашага існаваньня. Іншая рэч, што калі існуе мода на паталёгіі, дык людзі саромеюцца сваёй нармальнасьці і часам няпроста знайсьці звычайнага нармальнага чалавека. Выглядае нават на тое, што сёньня найбольшую цікавасьць уяўляюць якраз *звычайныя* людзі.

Людзі як людзі. Адны дагэтуль змагаюцца зь ветракамі камунізму, другія прапануюць уніфікавацца на ўзроўні эўрапейскага абывателя. Адны перабіраюць багоў пад свой густ, а іншыя вінавацяць увесь сьвет у сваіх грахах. Адны чакаюць 2000 году, быццам нешта залежыць ад тых лічбаў. Другія затаіліся ў чаканьні Крывэ–Крывэйтэ. Адны шукаюць Беларусь за акіянам, другія — у Інтэрнэце. Але будзем спадзявацца, што ў гэтай плюралістычнай какафоніі ўсё ж крышталізуецца тая норма, якой, сьвядома ці не, жадае кожны. Кожны мае ў сабе часьцінку ідэалізму, якая ўраўнаважвае наша жыцьцё, цягне нас уверх зь непазьбежнага балота. Урэшце, толькі ў гэтай раўнавазе і магло ўзьнікнуць чалавецтва. Будзем спадзявацца, што яе нам удасца захаваць і надалей, — каб захаваць саміх сябе.

**Віктар Аўтушка**